# СА СКАРЫНАМ

■ Да святкавання 500-годдзя беларускага кнігадрукавання Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт рыхтуе шэраг цікавых мерапрыемстваў.

Так, Навуковая бібліятэка аб'явіла фотаконкурс для студэнтаў, супрацоўнікаў і ўсіх зацікаўленых — трэба сфатаграфавацца з помнікам, білбордам або іншай выявай Францыска Скарыны, даць фотаздымку назву і прынесці ці даслаць картку ў бібліятэку да 31 мая. Вынікі конкурсу будуць падведзены ў верасні, пераможцаў чакаюць памятныя прызы, а творы ўдзельнікаў будуць экспанавацца ў выставачнай зале Навуковай бібліятэкі.